Валянціна АСТРОГА

# Настаўніцы Беларусі ў другой палове XIX—пачатку XX ст.



*АСТРОГА Валянціна Міхайлаўна — дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук. Нарадзілася ў в. Жарсцвянка Пастаўскага р-на Віцебскай вобл. У 1990 г. закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2004 г. — аспірантуру БДУ. Даследуе пытанні гісторыі народнай асветы Беларусі ў другой палове XIX—пачатку XX ст. Аўтар больш за 45 навуковых публікацый.*

Настаўнік заўсёды быў, ёсць і будзе цэнтральнай фігурай вучэбна-выхаваўчага працэсу ў школе. Ад канкрэтнага педагога, яго кваліфікацыі і светапогляду залежыць тое, як на практыцы будуць вырашаны пастаўленыя дзяржавай задачы ў галіне адукацыі. Вядомы рускі праваслаўны дзеяч XIX ст. І.Карчынскі справядліва адзначаў, што "якія б мэты не ставілі школе, яны не будуць дасягнуты, калі асоба настаўніка не будзе адпавядаць гэтым мэтам", і калі настаўнік — "душа школы" — не зойме належнага і дастойнага месца ў грамадстве[1]. У XIX ст. недахоп добра падрыхтаваных настаўнікаў быў характэрны практычна для кожнай краіны, аднак асабліва вострым з'яўляўся на тэрыторыі Расійскай імперыі пасля правядзення буржуазных рэформ 1860-х—1870-х гг. У дадзеным артыкуле мы разгледзім уключэнне жанчын Беларусі ў педагагічную дзейнасць у сярэдзіне XIX—пачатку XX ст.

Да сярэдзіны XIX ст. педагагічная дзейнасць жанчын абмяжоўвалася выключна службай у якасці дамашніх настаўніц. Толькі пачынаючы з 1870-х гг. у сельскіх школах сталі з'яўляцца жанчыны-настаўніцы. У Пецярбургу і Маскве ўзніклі таварыствы настаўніц (Фрэбелеўскае таварыства ў Пецярбургу (1871 г.), "Таварыства садзеяння дашкольнаму выхаванню" ў Маскве і Пецярбургу (1907 г.), пазней у Чалябінску і Іванава-Вазнясенску), галоўнай задачай якіх было працаўладкаванне жанчын і стварэнне сістэмы іх педагагічнай адукацыі. У 1868 г. пасля доўгіх намаганняў расійскай грамадскасці, занепакоенай адсутнасцю неабходнай колькасці настаўнікаў, а таксама матэрыяльнай незабяспечанасцю выпускніц жаночых вучылішчаў, быў прыняты закон, паводле якога пры жаночых вучылішчах пачалі арганізоўваць педагагічныя курсы. Выпускніцы гэтых курсаў атрымлівалі званне дамашняй настаўніцы без права на афіцыйную службу. У цэнтральных губернях Расійскай імперыі працавалі арганізаваныя яшчэ ў XVIII ст. дваранскія інстытуты шляхетных дзяўчат ("благородных девиц"), з XIX ст. пачалі адкрывацца вышэйшыя жаночыя Бястужаўскія курсы ў Пецярбургу, Маскве, Адэсе, Харкаве, жаночыя педагагічныя інстытуты ў Пецярбургу, Маскве, Казані, Белградзе, Томску, Феадосіі, Тамбове, Вільні і іншыя навучальныя ўстановы.

На тэрыторыі Беларусі жаночая адукацыя развівалася марудна. Пачынаючы з 1860-х гг. па ініцыятыве вядомага педагога М.А. Вышнеградскага пачалі стварацца жаночыя сямікласныя марыінскія гімназіі, выпускніцы якіх працавалі ў пачатковых школах. Такія гімназіі на тэрыторыі Беларусі былі створаны ў Магілёве (1863 г.),



*Мінская жаночая марыінская гімназія.* Пачатак XX ст.

Вільні (1869 г.), Мінску (1899 г.), Віцебску (1905 г.). Пазней жанчын-педагогаў пачалі рыхтаваць спецыяльна арганізаваныя пры гімназіях Міністэрства народнай асветы дадатковыя восьмыя педагагічныя класы. Яны адкрываліся на аснове "Палажэння аб жаночых гімназіях і прагімназіях" 1870 г., а таксама спецыяльнага "Палажэння аб педагагічных класах" 1874 г. На тэрыторыі Беларусі першы такі клас быў створаны толькі ў 1906 г. у Полацку. Гэтыя сярэднія навучальныя ўстановы давалі дастаткова грунтоўную агульнаадукацыйную падрыхтоўку.

Духоўнае ведамства рыхтавала неабходных настаўніц у сёмых педагагічных класах епархіяльных вучылішчаў. З 1 ліпеня 1911 г. Міністэрства народнай асветы дазволіла адкрыць першую ў Віленскай навучальнай акрузе жаночую Аршанскую настаўніцкую семінарыю. У 1914 г. пачала працаваць Барысаўская, а ў 1916 г. Бабруйская жаночыя настаўніцкія семінарыі. У адрозненне ад сярэдніх навучальных устаноў (гімназій і прагімназій), дзе навучанне было платнае, семінарыі давалі бясплатную адукацыю на конкурснай аснове. Гэта дазваляла атрымаць адукацыю жанчынам з ніжэйшых саслоўяў.

У 1906 г. настаўніцы дамагліся права выкладаць у малодшых класах мужчынскіх навучальных устаноў, а ў 1911 г. былі фармальна ўраўнаваны з педагогамі-мужчынамі пры атрыманні вышэйшай адукацыі. Аднак дзверы ўніверсітэтаў Расійскай імперыі былі фактычна заўсёды зачынены перад жанчынамі[2]. Толькі ў выключных выпадках жанчыны маглі атрымаць адукацыю ва ўніверсітэце. "Піянеркай" у гэтай справе стала Багданава (Быкава), якая потым прысвяціла сваё жыццё працы ў народнай школе.

Паводле афіцыйных даных, у 1898 г. у 50 губернях Расійскай імперыі настаўніцы пачатковых вучылішчаў Міністэрства народнай асветы складалі 47% ад агульнай колькасці настаўнікаў. У Віленскай навучальнай акрузе — каля 30% ад агульнай колькасці настаўнікаў: у Мінскай губерні — 34%, Віцебскай — 33%, Віленскай — 30%, Магілёўскай — 28% і Гродзенскай — 22%[3]. У наступныя гады назіралася тэндэнцыя росту гэтых паказчыкаў. Так, у 1915 г. у пачатковых школах розных тыпаў (міністэрскіх, народных, царкоўна-прыходскіх, школах граматы, прыходскіх вучылішчах, яўрэйскіх вучылішчах, гарадскіх вучылішчах) Віленскай навучальнай акругі працавалі 4 617 мужчын і 4 321 жанчына.

Адукацыйны ўзровень настаўнікаў Расійскай імперыі ў 1880—1890-я гг. быў невысокі. Спецыяльную педагагічную падрыхтоўку мелі толькі 25% настаўнікаў і 8% настаўніц. Улічваючы тых, хто атрымаў адукацыю ў духоўных семінарыях і жаночых гімназіях, агульная колькасць настаўнікаў, знаёмых з педагогікай, складала 35,9%. У пачатку XX ст. адукацыйны ўзровень жанчын-настаўніц быў вышэйшы ў параўнанні з узроўнем мужчын-выкладчыкаў: сярэднюю адукацыю мелі $^2/_3$ настаўніц і толькі $^1/_3$ настаўнікаў[4].

Па сацыяльнаму складу сярод настаўніц Расійскай імперыі ў 1880 г. было 22% дачок асабістых і 8% — спадчынных дваран, 44% — духавенства і ўсяго 7% — сялян. У 1910-я гг. асяроддзе настаўніц папаўнялася выхадцамі з сялян, сельскага духавенства, а таксама дробных чыноўнікаў. За трыццаць гадоў — з 1880 г. да 1911 г. — сацыяльны склад настаўніц Віленскай навучальнай акругі змяніўся: колькасць выхадцаў з дваран зменшылася з 23,8 да 15,2%, духоўнага стану — з 68,5 да 31,5%, сялян — павялічылася з 1,2 да 23,7%, мяшчан — з 3,7 да 16,4 %, іншых — з 2,8 да 13,2%[5]. У сярэдняй школе працавалі ў асноўным дзеці дваран, чыноўнікаў і духавенства.

Па ўзросту большасць настаўнікаў належала да моладзі. У 1880 г. мужчыны ва ўзросце да 30 гадоў складалі каля 77% настаўнікаў, у 1911 г. — 70%, жанчыны — 87% і 81% адпаведна. У 1880 г. большасць настаўнікаў і амаль усе настаўніцы (90%) не знахо-



*Класная дама Мінскай жаночай марыінскай гімназіі М.Бязводнава.* 1908 г.



*Вучаніцы Мінскай жаночай марыінскай гімназіі.* 1913 г.

дзіліся ў шлюбе. У пачатку XX ст. ва ўсіх беларускіх губернях $^3/_4$ усяго выкладчыцкага персаналу складалася з халастых настаўнікаў і незамужніх настаўніц[6].

Ва ўмовах цяжкай працы, якая да таго ж не забяспечвала матэрыяльных патрэб настаўнікаў, многія з іх не вытрымлівалі працяглых тэрмінаў службы. Тыя, хто меў сярэднюю адукацыю, пры першым зручным выпадку пакідалі школу. Настаўніцы вельмі часта працавалі толькі да выхаду замуж. У многіх губернях Расійскай імперыі гэтага нават патрабавалі дырэкцыі народных вучылішчаў. Са справаздач аб народных вучылішчах і царкоўна-прыходскіх школах канца XIX ст. бачна, што большая частка настаўнікаў служыла 3—5 гадоў, і выкладанне з'яўлялася для іх толькі часовым заняткам[7]. Напрыклад, у 1912 г. сярэдняя працягласць працы настаўнікаў Віцебскай губерні складала 6,7 гадоў, настаўніц — 6,1 гадоў.

Прававое становішча настаўнікаў рэгулявалася шырокай нарматыўна-прававой базай. Гэта былі законы, пастановы, цыркуляры, інструкцыі, палажэнні, якія вызначалі агульныя правы і абавязкі, дадатковыя льготы і перавагі настаўнікаў. Аднак абавязкаў і павіннасцей сярод іх было значна больш, чым ільгот і пераваг. Рускі педагог І.Белаконскі трапна заўважаў, што прававое становішча настаўніцтва "знаходзіцца ў поўнай залежнасці не толькі ад кожнага члена вучылішчнага савета ці чыноўніка дырэкцыі народных вучылішчаў, але і ад старасты, старшыны, пісара, урадніка і нават карчмара". Гэты спіс дапаўнялі мясцовы бацюшка, члены валасных і земскіх упраў. "І ўсім гэтым асобам і ўстановам настаўнік не толькі павінен падпарадкоўвацца, але і "дагаджаць" кожнаму адпаведна іх праву". Пры гэтым у большасці выпадкаў не было спецыяльных асоб і ўстаноў, якія б маглі аднаўляць парушаныя правы настаўніка і дапамагаць яму, "прыціснутаму цёмнымі сіламі вёскі"[8].

Яшчэ цяжэй працаваць і заслужыць давер і павагу з боку сялян і мясцовага святара было жанчынам-настаўніцам, да ведаў і педагагічнай дзейнасці якіх вясковыя жыхары адносіліся з недаверам. Сяляне нават прасілі дырэкцыі народных вучылішчаў прысылаць менавіта настаўніка, а ў прыгаворах валасных сходаў (як, напрыклад, сходу Гладноўскай воласці Чавускага павета) гучалі і такія рашэнні: "Жалаванне настаўніцам не дабаўляць, але калі будзе нам назначаны настаўнік, у якім насельніцтва воласці крайне мае патрэбу, то мы выдзелім яму і 300 руб."[9]. Вельмі часта да жанчын-настаўніц адносіліся з перадузятасцю праваслаўныя святары. Так, на дзвюх настаўніц з Магілёўскай губ., сясцёр Марыю і Людмілу Палянскіх, у 1910 г. святар даносіў, што "за год ні разу не былі ў царкве, ... вялі надзвычай амаральны лад жыцця, прапагандуючы народу бязбожжа і навязваючы вучэнне Дарвіна"[10]. Такія дакоры звычайна тлумачыліся тым, што настаўніцы не маглі арганізаваць царкоўны хор. Святары адкрывалі царкоўныя школы і пераманьвалі вучняў з народных вучылішчаў да сябе, нават "шляхам абяцанняў і раздачы гасцінцаў (калачоў)", як пра гэта паведамляла ў Мінскую дырэкцыю народных вучылішчаў пра святара Загароўскага "вучыцелька Малевіч"[11]. Яшчэ часцей чапляліся законанастаўнікі да выкладчыц царкоўных школ. Так, у Гродзенскім павеце святар публічна падчас службы ў царкве назваў О.Бобрык "штрафной настаўніцай", якая страціла "маральны крэдыт царкоўнай школы"[12].

І толькі ў рэдкіх выпадках, як, напрыклад, у адносінах да настаўніцы Дрыбінскага вучылішча Магілёўскай губ. Н.Фёдаравай, інспектар і дырэкцыя маглі падтрымаць настаўніцу. У гэтым канкрэтным выпадку было адзначана, што яна "старанная і дастаткова адданая сваёй справе настаўніца, шмат працуе над сабою ... з яе выйдзе з часам вельмі талковая і карысная работніца ў народнай школе, яна шчырая і праўдзівая натура, яе няхітрыя тлумачэнні заслугоўваюць поўнага даверу"[13]. А за настаўніцу Збаміро



*Ваўкавыская жаночая гімназія.* Пачатак XX ст.

кую з Трыхалеўскага вучылішча, якую спрабавалі напужаць і абгаварыць мясцовыя святар і псаломшчык, заступілася валасное праўленне. Яго члены заявілі ў Віцебскую дырэкцыю народных вучылішчаў, што "паводзіны яе маральныя ў самай высокай ступені і ні ў чым кепскім [яна] не заўважана"[14].

Між іншым, здараліся і такія выпадкі, калі паміж святарамі і настаўнікамі наладжваліся амаль сяброўскія адносіны. Тады законанастаўнікі імкнуліся падтрымаць настаўнікаў, накіроўвалі ў дырэкцыі народных вучылішчаў адпаведныя лісты. Так, святар А.Смоліч прасіў узнагародзіць настаўніцу В.Кутасаву з Турынскага вучылішча Ігуменскага павета, якая "чвэрць стагоддзя з вялікай энергіяй, нястомна працуе на ніве асветы роднага народа, не засмучаецца ні цяжкімі матэрыяльнымі ўмовамі, ні вялізнай колькасцю вучняў (да 100 чалавек)... гэта заслуга, гэта вялікі подзвіг, дастойны як маральнай падтрымкі, так і паляпшэння матэрыяльных умоў існавання"[15]. Акрамя грашовых дапамог і заахвочванняў настаўнікі маглі атрымаць ганаровыя ўзнагароды, удастойваліся сярэбраных і залатых медалёў з надпісам "За усердие", звання ганаровага грамадзяніна, падзяк ад вышэйшага начальства, юбілейных падарункаў. Так, настаўніцы М.Мядзведкава з Тапорскага вучылішча і Ю.Заяц з Іванаўскага вучылішча Невельскага павета Віцебскай губ., якія ўжо мелі сярэбраныя медалі, былі прадстаўлены да залатых медалёў на Анінскай стужцы за выдатную і старанную 33-х і 40-гадовую службу[16].

Адносна замяшчэння жанчынамі пасад выкладчыкаў у пачатковых вучылішчах ва ўрада былі свае меркаванні. Па назіраннях многіх інспектараў, выкладчыцы часта аказваліся лепшымі работніцамі, чым мужчыны. У палажэнні 1874 г. "Аб пачатковых народных вучылішчах" было заўважана: "сустракаемая часта паміж настаўнікамі незадаволенасць сваім лёсам і жаданне пераманіць яго зусім не складае адметнай рысы настаўніц па той прычыне, што перад жанчынай адкрыта значна менш дарог, чым перад мужчынай, і паміж імі выкладанне ў народных школах належыць да ліку лепшых". Акрамя большай прыхільнасці да свайго прызвання, настаўніцы часта "ўяўляюць яшчэ перавагу больш лагоднага, цярплівага абыходжання з вучнямі, большай прывычкі да парадку і ахайнасці, меншай схільнасці да засваення тых цёмных бакоў вясковага жыцця, ад уплыву якіх не заўсёды, на жаль, застаецца свабодным настаўнік"[17]. У той жа час пры пэўных абставінах настаўнік меў перавагу: там, дзе насельніцтва было настроена супраць жанчын, дзе неабходна была цвёрдасць для падтрымкі школьнай дысцыпліны, дзе было пажадана развіццё такіх рамёстваў, навучанне якім мог узяць на сябе толькі мужчына.

Па водгуках інспектараў народных вучылішчаў і наглядчыкаў, асабліва здольнымі для выкладання ў вясковых школах з'яўляліся выхаванкі епархіяльных духоўных вучылішчаў. У гэтых навучальных установах яны атрымлівалі навыкі выкладання, працуючы пад кіраўніцтвам настаўніка педагогікі з выхаванцамі існуючых пры вучылішчах прытулкаў. Акрамя гэтага, "яны прыносяць з сабою з бацькоўскага дому звычку да простага вясковага жыцця, якая захоўваецца і ў вучылішчы дзякуючы яго сціпламу абсталяванню"[18].

У 1907 г. выйшлі дзве пастановы Міністэрства народнай асветы: "Аб мерах прыцягнення да педагагічнай дзейнасці ў народных вучылішчах асоб жаночага полу з асяроддзя сельскага настаўніцтва" і "Аб прыняцці мер па ахове народных настаўніц ад цяжкіх маральных і матэрыяльных умоў"[19]. Нягледзячы на тое, што выкананне гэтых пастаноў ускладалася на інспектараў і наглядчыкаў, у большасці выпадкаў яны засталіся толькі на паперы.

Катэгорыя сельскіх народных "вучыцеляў" сярод усёй настаўніцкай інтэлігенцыі вызначалася асаблівай беднасцю. Галоўным крытэрыем матэрыяльнага дабрабыту быў узровень заработнай платы, адзіная сістэма якой у Расійскай імперыі адсутнічала. Як сведчаць дакументы, памер заробку не толькі ў губерні, але ў павеце і нават воласці быў розны і на працягу ўсёй другой паловы XIX ст. вагаўся звычайна ў памеры ад 150 да 250 рублёў у год. Штогод у першыя дні студзеня сяляне збіраліся на раскладачны сход, дзе вызначалі памеры грамадскіх сродкаў, у тым ліку і на вучылішчы. Агульным рашэннем прымалася пастанова і аб памерах заробку настаўніка. Прычыну памяншэння яго ў канкрэтным годзе маглі тлумачыць беднасцю ці неўраджаем. Калі ж сума была настолькі маленькая, што яе нельга было ўрэзаць, то на летнія месяцы настаўніка маглі пазбавіць асвятлення (свечак або газы), прыслугі, "ссыпкі" (харчавання) і г.д. Звычайна дзяржава плаціла толькі трэцюю частку заработнай платы настаўніка, а астатнія грошы выдзяляла сялянская абшчына. Так, настаўніцы Казімірава-Слабодскага вучылішча Магілёўскай губ. ва неўраджайны год замест 250 рублёў было назначана толькі 150, прычым з іх знята 5 рублёў на канцтавары і 20 — на асвятленне. А ў Рэкаўскай воласці той жа Магілёўскай губерні сяляне адмянілі рашэнне аб выплаце заробку настаўніку і іншых выдаткаў на школу, у выніку чаго "жыццё і весці вучэбную справу пры такіх умовах стала немагчыма"[20]. Яшчэ менш атрымлівалі настаўніцы школ духоўнага ведамства — ад 120 да 200 рублёў. У некаторых гу-

бернях з настаўнікамі маглі разлічвацца не толькі грашыма, але і хлебам з гароднінай і нават па чарзе "ўтрыманнем сталом на працягу ўсяго часу навучання". Такі разлік за працу быў няэручны і зневажальны для настаўнікаў. У педагагічным друку адзначалася: "сельскі настаўнік вымушаны быў, як жабрак, атрымліваць тое, што яму даюць, а не тое, што яму належыць". З дзённіка адной сельскай настаўніцы, якая працавала ў Беларусі, можна даведацца, што на валасным сходзе сяляне вельмі проста маглі адмяніць "ссыпку", бо, як яны тлумачылі, "гады худыя, хлеб дарагі... самім есці няма чаго, а тут і таму дай, і другому дай"[21]. Нестабільнасць у аплаце працы выклікала няўпэўненасць педагогаў у заўтрашнім дні, падрывала іх жаданне працаваць і штурхала на пошукі лепшага месца.

На мяжы стагоддзяў дырэкцыі прызналі неабходным павялічыць зарплату народным настаўнікам да 300 рублёў у год. Аднак столькі плацілі не ў кожным вучылішчы. Выключэннем былі толькі міністэрскія школы, дзе выкладчыкі атрымлівалі 360 рублёў у год. Такія грошы ледзьве дазвалялі зводзіць канцы з канцамі ва ўмовах імклівага падаражання харчовых і спажывецкіх тавараў. Але пры пэўных спрыяльных абставінах, жаданні, спрыце і выдатнай працы настаўнікаў іх матэрыяльнае становішча магло некалькі палепшыцца. Грашовыя ўзнагароды можна было атрымаць за бездакорную дадатковую працу ў школе. Так, настаўніца Падзейкаўскага вучылішча Магілёўскай губерні Г.Арлова па сваёй ініцыятыве з 1910 г. пачала вучыць дзяўчынак абутковаму майстэрству. Вырабы вучаніц трапілі ў павятовую земскую ўправу і былі ацэнены вельмі высока. Земскія ўлады прызналі справядлівым не толькі аднаразова ўзнагародзіць настаўніцу, але выдаваць ёй грошы штомесяц: 60 рублёў за дадатковую працу і 20 — на пакупку неабходных для заняткаў матэрыялаў. Такія ж сумы выдаткоўваліся Магілёўскай губернскай земскай управай настаўніцы Ш.Халастовай з Сергіеўскага вучылішча за выкладанне вязання, шыцця і вышывання, а таксама некаторым іншым настаўніцам[22]. Большасць жа настаўніц па-ранейшаму праводзілі дадатковыя заняткі на грамадскіх пачатках. А вось першая настаўніца Янкі Купалы А.Сонцава, якая добра іграла на фартэпіяна і дасканала ведала французскую і нямецкую мовы, выкарыстоўваючы свой высокі адукацыйны ўзровень, давала прыватныя ўрокі дзецям мясцовых багацеяў[23].

Настаўніцы гарадскіх вучылішчаў мелі большую зарплату ў параўнанні з вясковымі. Напрыклад, па Віцебскай губерні на 1 студзеня 1891 г. за працу ў прыходскім вучылішчы плацілі ў сярэднім 250 рублёў, праз 10 гадоў (1901 г.) — па двух віцебскіх — 400, па астатніх губернскіх і павятовых — 300 рублёў[24]. Праз два гады мінімальны заробак складаў ужо 360 рублёў. Дакументы, аднак, сведчаць, што, напрыклад, у Мінску на мяжы стагоддзяў заробак настаўніцы быў ніжэйшы за заробак настаўніка больш як на 100 рублёў. Становішча настаўніц сярэдніх школ было значна лепшае. Выхадцы галоўным чынам з дваранскага асяроддзя або заможнай буржуазіі мелі вышэйшую адукацыю і, адпаведна, добрыя аклады. На грашовае ўтрыманне ўплывалі таксама педагагічны стаж і вучэбная нагрузка. У канцы XIX ст. заробак настаўніцы з сярэдняй адукацыяй складаў 600—700 рублёў. Акрамя гэтага, настаўніцы гімназій маглі даваць вучням сваіх класаў прыватныя ўрокі, аплата за якія была дастаткова высокая. Пры раз-



*У.Макоўскі. У сельскай школе. 1883 г.*



Выпускніца Віцебскага настаўніцкага інстытута Раіса Спаская. 1913 г.



Копія 56

Свидѣтельство.

Предъявительница сего, Раиса Васильевна Спасская, родившаяся 22 марта 1878 года, окончившая курсъ VII классовъ Витебской Мариинской женской гимназіи, на основаніи ВЫСОЧАЙШЕ утвержденнаго закона 25 августа 1912 года (ст. VIII), подвергалась въ Педагогическомъ Совѣтѣ Витебскаго Учительскаго Института испытанію на званіе учительницы высшаго начальнаго училища и оказала слѣдующія познанія:

По педагогикѣ (психологіи, педагогикѣ, дидактикѣ, логикѣ и исторіи педагогики всеобщей и русской) удовлетворительныя (3)

„ Методикѣ русскаго языка (3)

„ Методикѣ ариѳметики (4)

„ Методикѣ геометріи удовлетворительныя (3)

Кромѣ того, пробными уроками она, Раиса Спасская, показала умѣнье преподавать, а потому Педагогическій Совѣтъ Института и призналъ ее, Раису Спасскую, достойною званія учительницы высшаго начальнаго училища по математикѣ (ариѳметикѣ и геометріи).

Въ удостовѣреніе сего и дано это свидѣтельство за надлежащею подписью и приложеніемъ Институтской печати.

Г. Витебскъ.

Октября 28 дня 1913 года.

Предсѣдатель Педагогическаго Совѣта Директоръ Института

Члены Совѣта

Секретарь Совѣта

Пасведчанне аб заканчэнні Віцебскага настаўніцкага інстытута на імя Раісы Спаскай. 1913 г.

меркаванні сродкаў гімназій педагагічнымі саветамі прадугледжваўся такі артыкул, як аказанне настаўнікам матэрыяльнай дапамогі і заахвочванне іх поспехаў у педагагічнай і навуковай дзейнасці. Разам з тым, кіраўніцтва не спяшалася ўключаць у педагагічныя калектывы сярэдніх школ жанчын, што тлумачылася іх абмежаванымі магчымасцямі атрымаць вышэйшую адукацыю, а таксама абцяжарваннем сямейнымі турботамі, якія разглядаліся як перашкода для паўнацэннай работы. Куратары Віленскай навучальнай акругі прапаноўвалі адхіляць настаўніц, якія ўзялі шлюб, ад працы ў гімназіях, бо яны "не могуць удзяліць неабходную ўвагу сваім абавязкам". Міністэрства народнай асветы не было настолькі катэгарычнае і прадпісвала кожны выпадак разглядаць асобна[25].

Каб скласці ўяўленне аб набытай педагогамі маёмасці і ўсім тым, што акружала іх у паўсядзённым жыцці, варта звярнуцца да спісаў настаўніцкіх рэчаў, што згарэлі падчас пажараў у будынках народных вучылішчаў. Усё багацце адзінокіх настаўнікаў і настаўніц звычайна складаў кухонны посуд, некалькі кніг і адзенне з абуткам. Замужнім настаўніцам і жанатым настаўнікам "кватэру прыходзілася абстаўляць сямейным чынам... з мэтай хоць нямнога зрабіць прывабным той вугал, у якім прыходзілася жыць". У спісах страт сустракаюцца пасцельная бялізна, абрусы, ручнікі, альбомы, дываны, коўдры, падушкі, мэбля, чамаданы і г.д. Адзенне вясковых настаўнікаў і членаў іх сем'яў было сціплае. Яны "знаходзяць задавальненне ў нашэнні самага простага адзення, блізкага да сялянскага... таму на яго ідзе вельмі невялікая сума"[26]. Іх гарадскія калегі павінны былі добра апранацца, бываць у гасцях, прымаць іх у сябе і несці іншыя выдаткі, звязаныя з гарадскім жыццём. Толькі маладыя настаўнікі, дзеці заможных бацькоў, маглі хадзіць "франтавата" і мець некалькі касцюмаў, сукенак, шубу. Таму нядзіўна, што крадзёж у настаўніцы Т.Валасковай верхняга адзення коштам 40 рублёў быў сапраўднай трагедыяй, пасля чаго яна "апынулася ў самым бязвыхадным становішчы"[27].

Большасць настаўнікаў працавала ў непрыстасаваных будынках, якія адводзіліся пад школы. У сваіх рапартах яны характарызавалі школьныя па-

мяшканні прыкладна так: "угарнае", цесната, духата, у вокнах няма зімовых рам, "без адзінай форткі", драўляныя падлогі рэдкія. Узвядзенне новых будынкаў каштавала сялянам вельмі дарага. Настаўніца Н.Самковіч паведамляла, што будынак Мхерынскай царкоўна-прыходскай школы Мінскай губерні "прапускаў снег і вецер". Ён быў хоць і новы, але зроблены "на хуткую руку" з сырога дрэва, якое рассохлася. Таму "заставацца зімаваць... [было} немагчыма, не рызыкуючы падвяргаць сябе пастаяннай прастудзе і ўсялякім іншым нязручнасцям"[28]. Лепшыя будынкі наняць у вёсцы было немагчыма, бо іх проста не было. У друку крытыкаваліся "немагчымыя памяшканні" для школ, гаварылася аб неабходнасці будаваць новыя і сучасныя школы. Аднак узорныя і добраўпарадкаваныя народныя вучылішчы пачалі масава ўзнікаць на тэрыторыі Беларусі толькі з канца XIX ст. У сяле Сварыцэвічы Пінскага павета, вёсцы Цялушкі Бабруйскага павета і іншых месцах у "велічных школьных будынках" размяшчаліся і кватэры настаўніц, якія складаліся "з трох пакояў, кухні, пярэдняй, сенцаў і кладоўкі", былі вельмі "зручныя, чыстыя, светлыя і дастаткова мэбляваныя"[29].

У канцы XIX — пачатку XX ст. у Віцебску, Мінску, Гродна, Вільні, Магілёве пачалі ўзнікаць педагагічныя таварыствы ўзаемадапамогі, якія мелі на мэце "дапамагаць тым, хто знаходзіцца ў беднасці, хто вучыць і вучыў у сельскіх і гарадскіх пачатковых народных вучылішчах, грашовымі дапамогамі і іншымі відамі". Абавязковымі членамі таварystваў станавіліся і настаўніцы, якія неаднаразова звярталіся ў праўленні таварыстваў за грашовымі дапамогамі на лячэнне, выхаванне дзяцей, па прычыне цяжкага матэрыяльнага становішча, у выніку знішчэння пажарам асабістай маёмасці і г. д.

Такім чынам, прыцягненне да выкладчыцкай дзейнасці жанчын, станаўленне і развіццё жаночай педагагічнай адукацыі станоўча паўплывала на сістэму асветы і фарміраванне перадавой часткі інтэлігенцыі Беларусі. Разам з тым, на працягу другой паловы XIX — пачатку XX ст. адкрытым заставалася пытанне паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту настаўніц, павышэння іх прававога і сацыяльнага статусу ў грамадстве.

---

[1] Корчинский И. Личность учителя начальной церковной школы. Гродно, 1901. С. 1.

[2] Паначин Ф.Г. Педагогическое образование в России. Историко-педагогические очерки. М., 1979. С. 97.

[3] Кириллов М.К. Начальная школа Белоруссии во второй половине XIX и в начале XX в. (1870—1907) // Из истории школы Белоруссии и Литвы / Под ред. В.З. Смирнова. М., 1964. С. 104.

[4] Начальное народное образование в Витебской губернии в 1912 г. Витебск, 1915. С. 65.

[5] Однодневная перепись начальных школ в империи, произведённая 18 января 1911 года. Выпуск VIII. Виленский учебный округ. СПб., 1914. С. 15.

[6] Паначин Ф.Г. Педагогическое образование в России. С. 135; Фальборк Г., Чарнолуский В. Народное образование в России. Исторический очерк. СПб., б. д. С. 56.

[7] Народное образование в церковно-приходских школах Могилёвской епархии в 1913/14 уч.г. Могилёв, 1915. С. 39.

[8] Белоконский И. Учительский вопрос в народной школе // Русская школа. 1899, № 1. С. 135, 139.

[9] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). Ф. 2254, воп. 2, спр. 283, арк. 57.

[10] Там жа. Спр. 678, арк. 20.

[11] Там жа. Ф. 458, воп. 1, спр. 51, арк. 105.

[12] НГАБ у г. Гродна. Ф. 535, воп. 1, спр. 1, арк. 21—22.

[13] НГАБ. Ф. 2254, воп. 2, спр. 418, арк. 89.

[14] Там жа. Ф. 2507, воп. 1, спр. 1674, арк. 1.

[15] Там жа. Ф. 458, воп. 1, спр. 240, арк. 54.

[16] Там жа. Ф. 2507, воп. 1, спр. 3966, арк. 4—5.

[17] Настольная книга по народному образованию: В 3 т. / Сост. Г. Фальборк, В. Чарнолуский. Т. III. СПб., 1904. С. 1770.

[18] Там жа.

[19] Сборник распоряжений по Министерству народного просвещения. СПб., 1907. С. 21, 28.

[20] НГАБ. Ф. 2254, воп. 2, спр. 488, арк. 32, 34.

[21] В.К. Тяжёлая доля. Отрывки из "Дневника" сельской учительницы (работавшей в Белоруссии). Витебск, 1903. С. 22.

[22] НГАБ. Ф. 2084, воп. 1, спр. 134, арк. 2—9.

[23] Першая настаўніца народнага песняра // Народная асвета. 1972, № 6. С. 55.

[24] Кукушкин И.П. Последнее десятилетие в истории Витебской Дирекции народных училищ (1891—1901). Витебск, 1904. С. 43.

[25] Еўдакімава А. З вопыту падрыхтоўкі настаўнікаў для Беларусі (XIX ст.) // Беларускі гістарычны часопіс. 1997, № 1. С. 79.

[26] Тарнавский А. Об обязанностях учителя и учительницы начального народного училища. Опыт краткого руководства. М., 1904. С. 27.

[27] НГАБ. Ф. 458, воп. 1, спр. 240, арк. 49.

[28] Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917): В 3 т. Т. 3. Мн., 1953. С. 261.

[29] Краткий очерк основания в селе Сварицевичах Пинского уезда одноклассной церковно-приходской школы и торжественное освещение её 6 декабря 1903 г. // Минские епархиальные ведомости. 1904, 12 января. С. 53.